УДК 227(476)

# ПАХАВАННІ ЧАСОЎ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў ВАКОЛІЦАХ ГРОДНА, ЯК АБ’ЕКТЫ ТУРЫСТЫЧНАЙ ПРЫВАБНАСЦІ

**В.Р. Карнялюк**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, zrumljowa@mail.ru

У 2014 годзе свет будзе згадваць стагоддзе з часоў першай сусветнай вайны. Слыны польскі публіцыст Ян Ліпскі ў свой час напісаў, што гісторыя павінна быць брамаю ў будучыню. Такая спадчына ваеннай мінуўшчыны, як пахаванні загінуўшых, найбольш падыходзіць для такога сцверджання і такога стаўлення да мінулага.

Увагу да такой катэгорыі помнікаў ваеннай гісторыі, як пахаванні, мае і турызм. Людзі невыпадкова імкнуцца патрапіць на месцы былых бітваў. Палі ля Грунвальду, ля Лейпцыга, ля Барадзіна ці акваторыя Цусімскага заліву заўсёды ўзрушаць у душы і галаве дасведчанага вандроўніка хвалі пачуццяў і думак. Але, акрамя вядомых векапомных мясцін, звязаных з трагічнымі момантамі чалавечай мінуўшчыны, ёсць процьма месцаў, якія таксама ўвабралі ў сябе змест драматычных падзей. Калі б у гэтых узгорках і пералесках, ровах і гаях можна была бы запытаць, што яны памятаюць, то адказ быў бы адзіны – кроў ды апошнія імгненні жыццяў самых розных ваяроў.

Месцаў пахаванняў з часоў вайны 1914–1918 гг. у Беларусі – мноства[1]. На Гродзеншчыне іх – найбольш. У ваколіцах Гродна – у межах былой Гродзенскай крэпасці, на Смаргоньшчыне – у раёнах, дзе адбываліся баі крывавага Свянцянскага прарыву, на Ваўкавышчынне – на землях адступлення 1915 года., на Навагрудчыне – з часоў пазіцыйных баёў1915–1917 гг…: паўсюль знакі той вайны. Яны, хаця і засланёныя яшчэ большай колькасццю такіх жа сумных помнікаў нашай найноўшай гісторыі, але старыя людзі пра іх памятаюць. Па меншай меры яшчэ не забываюць пра тое, што такія пахаванні былі ў іх мясцовасці. Дзеля вяртання гэтых напамінаў пра вайну з забыцця неабходны намаганні і гісторыкаў, і ўладаў, і мясцовых жыхароў. Могуць у гэтай сітуацыі сваю практычную лепту ўнесці грамадскія і камерцыйныя арганізацыі.

У ваколіцах Гродна пахаванняў першай сусветнай шмат. Згодна спісу месцаў пахавання нямецкіх салдат, што загінулі ў часы той вайны мы знойдзем згадкі пра вёскі Рацічы, Курпікі, Бірулічы, Стрэльнікі, Парэчча, Галынка. Характар ваенных дзеянняў ўлетку 1915 г. на гродзенскім напрамку быў такі, што тэмп атступлення рускіх войск не дазволіў ваеннаму камандаванню на-

---

[1] У Беларусі на 2008 г. па падліках В. Багданава знаходзіцца 202 пахавання часоў Першай сусветнай вайны . У тым ліку на Гродзеншчыне – 87, на Берасцейшчыне – 53, на Міншчыне – 44, на Віцебшчыне – 18. (Богданов, В. Воинские захоронения Первой мировой войны на территории Беларуси: современное состояние Доклад на международной научно-практической конференции “Беларусь в годы Первой мировой войны. Сморгонщина: трагедия, героизм, память”. г.Сморгонь. май 2007 г. (с исправлениями по состоянию на май 2008 г.)// Режим доступа - http://www.fortressby.com/index.php?option=com_deeppockets&task=catContShow&cat=76&id=143&Itemid= (15.08.2013).

Полесгу

лежным чынам паклапаціцца аб загінуўшых. Гэтыя функцыі выканалі мясцовыя жыхары і немцы, што занялі гэтыя землі і змянілі расійскую ўладу. Аднак яшчэ да пачатку працяглай акупацыі кайзараўскіх войск – узімку і ўвясну 1915 года – у ваколіцах Гродна прайшлі баі лакальнага характару.

У свой час, у выніку занёмства з матэрыяламі расійскага дзяржаўнага ваенна–гістарычнага архіва ў Маскве, якія тычацца дзеянняў на пазіцыях Гродзенскай крэпасці ў 1915 годзе, ўдалося пазнаёміцца з шэрагам цікавых крыніц па вызначэнню і былых месцаў пахаванняў. У архіўных фондах штабоў арміяў знаходзіцца цэлая калекцыя самаробных карт, схемаў–крокаў, на якіх пазначаліся месца пахавання згінуўшых афіцэраў і салдат. Схемы, часцяком на абы–якой паперы, выконвалі малодшыя камандзіры рускіх і перадавалі ў штабы сваіх армій. Гэта была заведзёнка ў расійскай арміі, якая дапамагала весці хоць які–небудзь улік баявых стратаў. Такія схемы дапамаглі бы зарыетавацца ў будучым для знаходжання месцаў пахавання. З усёй велізарнай колькасці такіх крокаў , падчас даследвання пэўных падзей у гродзенскіх ваколіцах аўтарам гэтых радкоў былі зроблены копіі. «*В селении Сильвановцы на кладбищенском склепе обнаружено большое количество трупов нижних чинов – 65 вынуто и похоронено в 2–х братских могилах, остальные оставлены в склепе, т.к. трупы слишком разложились и склеп засыпан землёй. Сувалкский губернатор Куприянов начальнику штаба 10–армии. 27 марта 1915 г.*», – было напісана на адной з такіх схем. Пазней, дзякуючы дапамозе ўражэнца в. Сільванаўцы Яна Лялевіча, атрымалася непасрэдна на месцы пазнаёміцца з раёнам баёў і пахаванняў. Самым вялікім ўражаннем былі вясковыя могілкі. На ніх захаваўся цэлы мемарыял загінуўшых нямецкіх ваеннаслужачых, як афіцэраў, так і ніжніх чыноў. Мемарыял складаецца з пірамiды валуноў прыхопленых вапнай з крыжом наверсе. На пірамідзе прымацаваны камены шчыт з надпісам «1915». Зараз шчыт прысланёны побач. Злева ад піраміды скрозь траву бачыліся надмагіллі. Кожнае мела выгляд крыжа. Надпісы на каменных плітах надмагілляў не чытаюцца. Увесь мемарыял змешчаны амаль перад уваходам на могілкі. Углыбі знаходзіцца яшчэ адно пахаванне той вайны. На ім ляжаць рускія вайскоўцы. Магчыма яно і адпавядае той схеме, што захавалася ў расійскім ваенна–гістарычным архіве.

Адноўленныя па матэрыялах ваенна–гістарычнага архіва падзеі баёў ў ваколіцах Гродна ў лютым 1915 г. даёць магчымасць уявіць абставіны, пры якіх і загінулі пахаваныя на вясковых могілках воіны.

Баі ля в. Сільванаўцы былі часткаю манеўра расійскіх войск на сапоцкінскім напрамку ад гродзенскай крэпасці. Манёўр той, у сваю чаргу, быў часткаю контрнаступлення рускіх з мэтаю адсунуць праціўніка ад пазіцый крэпасці. У ходзе баёў бала ўзята вышыня на паўночным усходзе ад вёскі. У баю прыймалі ўдзел 2,3,4 батальёны 30 Пастаўскага палка, 2,3 батальёны 31 Аляксееўскага палка і часці 22 Ніжэгародскага палка. Вышыня была ўзята ў ноч з 20 на 21 лютага.[ 1. ]

У матэрыялах фонда 10–й арміі ёсць звесткі пра пахаванні ля в. Сільванаўцы некалькіх дзесяткаў чалавек, без згадвання якіх–небудзь нумароў і назваў баявых частак. Гэтым дакументам ёсць пацдверджанне у выглядзе месца, што захавалася ў полі, на ўскрайку вёскі. Той жа Ян Лялевіч неднаразова прыводзіў у належны стан крыж на магіле. Праяўлялі да яго цікавасць і сябры краязнаўчага аб'яднання "Гараднiца" (кір. Ларыса Грышуціна), якое існавала у пачатку 90–х гг. ХХ ст. У Гродне.

Пахаванні, што дачыцца мясцовасці лі в. Рацічы, звязаны з аперацыяй па вызваленню з акружэння ХХ армейскага расійскага корпуса генерала П. Булгакава. Вядома, што гэты корпус патрапіў у акружэнне ў Аўгустоўскіх лясах. І часткамі прарываўся да пазіцый гродзенскай крэпасці. Спроба вырваць яго з гэтага акружэння сіламі войск, што месціліся на пазіцыях крэпасці, былі па–большасці, марныя. Корпус быў знішчаны. Пра гэтую трагедыю пісаў у першым выданні кнігі "Памяць Гродзенскі раён" краязнаўца з Жылічаў Дзмітрый Гаўрылін – "Трагедыя і подзвіг 20–га рускага корпуса ў 1915 годзе". Прысвечана была ў тым жа выданні і публікацыя архіўных звестак пра пахаваных ля 3–га форта Гродзенскай крэпасці, ў братэрскіх магілах каля в. Баранавічы паблізу Сасновага гаю і каля шашы Гродна–Сапоцкін за 800 м. на поўнач ад в. Рацічы. (В. Карнялюк Спяшаліся на дапамогу).

За выключэннем некалькіх палкоў, моцна страціўшых асабовы склад, воіны палка засталіся ляжаць у блізкіх і далёкіх гродзенскіх ваколіцах і ў Аўгустоўскіх лясах. Аднак і сама спроба выратавання корпуса прывяла да немалых людзскіх стратаў. Наступленне працягвалася і пасля таго, калі стала вядома, што корпуса не стала. Задачай моманта для рускіх было захапіць вышыню 100.3, як важны пункт абароны немцаў. Гэта задача была ўскладзена на другі аддзел абароны крэпасці ( генерал–маёр Баёў, канадуючы 6–й дывізіяй XV армейскага корпуса генерала Торклуса,



Полесту

што напярэдадні быў перакінуты ў Гродна з Гомеля.), 24 пяхотнаму Сімбірскаму палку генерала Невяроўскага, часцям 336 Чалябінскага палка, 103 Петразаводскага палка, 104 Усцюжскага палка, якія размяшчаліся на пазіцыях 4–га фарта крэпасці. Менавіта гэтым часцям было загадана атакаваць вышыню.

Загад аб наступленні быў аддадзены 23 лютага ў 5 гадзін вечара. Пачатак наступлення – праз гадзіну. У журнале баявых дзеянняў камандзіра 24 Сімбірскага палка пакінуты запіс пра тыя падзеі: «*Три батальона быстро разместились и почти в сумерках начали наступление. Артиллерией противника был открыт мощный огонь. Полк дошёл до колючей проволоки, где понёс значительные потери и вынужден был отступить. Через три часа была проведена повторная атака, но с таким же результатом. Артиллерийский, ружейный и пулемётный огонь шёл со всех сторон и спрятаться от него было просто невозможно*» [ 2. ] .

Пасля неўдалых атак полк знаходзіўся ў акопах Пятразаводскага палка, дзе і правёў увесь дзень 24–га, умацоўваяся і ведучы бесперапынную стрэляніну з праціўнікам. У выніку гэтага дня рускія страцілі 50 чалавек.

На той жа пазіцыі на наступны дзень загінула яшчэ каля 200 чалавек. 26(13) лютага палку было загадана атакаваць вышынб узноў, захапіці і ўмацавацца на ёй. «*В четыре часа утра полк пошёл в атаку, захватил высоту и взял в плен около 100 человек и две батареи. Из–за недостатка людей батареи не могли быть вывезены. Огонь противника был слабее. Полк дошёл до южных окраин деревни Ратичи, но вынужден был отойти на высоту 100.3, а затем и в окопы Петразаводского полка*», – чытаем мы ў радках камандзірскага дзённіка. [ 3. ] Атака гэтага дня не засталася незаўважанай нават знакамітым расійскім «тоўстым» часопісам «Исторический вестник». На яго старонках згадвалася пра атаку, як пра паспяховы штурм, пры якім было захоплена некалькі соцен (!) палоных і шэсць гармат.( [ 4. ]

Але, тым не менш і на гэты раз вышыня не засталася за рускімі. У адным з баёў быў паранены камандзір палка. Начальнік штаба палка палкоўнік Ушакоў сам вадзіў рэшткі палка ў атаку і ўзяў вышыню. Аднак зноў змушаны быў адступіць. Зноў у “Журнале” палка чытаем: «*В семь часов вечера был приказ снова атаковать высоту вместе с батальёнам Челябинского полка. Нашему (Симбирскому) полку удалось набрать не более 200 человек кроме офицеров. Полк принял командир третьего батальёна подполковник Тупицын. Атаки были скоротечными. Челябинцы потеряли около 120 низших чинов и двуз офицеров. Отошли в окопы. Потери за все атаки с 11 (24) по 14 (27) включительно составили среди офицеров: 10–убитыми, 31 – ранеными, 2 – контуженных; среди низших чинов: убитых, раненых и пропавших без вести – 2988 человек*»[ 5. ].

Полк заняў пазіцыіі напаўночным ўскрайку в. Рацічы каля сямі гадзін вечара. Трафеі вышыні – сем нямецкіх гармат, куляміёты і палоныя – 11 афіцэраў і больш за 500 ніжніх чыноў.

Дадзеныя матэрыялы далёк не поўныя. Яны толькі ў агульных рысах складаюць уяўленне аб тых абставінах, якія звязаны з наступнымі пахаваннямі ў раёне в. Рацічы. І гэта звесткі толькі расійскіх архіваў. З гэтых крыніц нам вядома, што ў раёне Сапоцкніна з 6 па 10 лютага размяшчаліся часці 31 дывізіі XXI корпуса, а 14 лютага – часці 77 дывізіі XXXIX корпуса немцаў. Вядома, што для поўнай карціны патрэбны звесткі і нямецкіх архіваў.

Звяртае на сябе ўвагу і такая распаўсюджаная адметнасць пахаванняў першай сусветнай вайны – часцяком рускія і нямецкія воіны пахаваны разам. Прыкладам такога вызначанага, аднак безыменнага пахавання з’яўляецца вядомая братэрская магіла ў Гайнаўцы ў Падляскім ваяводстве Польшчы. А ў нас такім прыкладам ўспамінаюцца моглікі на праваслаўным кладбішчы ў в. Парэчча. Каменныя крыжы распаложаныя па дыяметру кола–узгорка, на якіх ледзь заўважныя надпісы... па–польску: “ Zolniez nieznany armii rosyjskej”, або рэшткі нямецкіх прозвішчаў. Цяпер на парэчскім мемарыяле першай сусветнай вайны ўзвышаюцца тры чорных крыжа. Сімвал агульнай памяці і смутку. Шматлікія іншыя пахаванні яшчэ чакаюць такой увагі да сябе.

Апісаныя ў нашым артыкулу дэталі асобнага гродзенскага эпізода падзей першай сусветнай вайны з’яўляюцца, на нашу думку, прыкладам сведчання пра вялікі гістарычны патэнцыял самых далёкіх куточкаў нашай краіны, якія, пры адпаведных высілках могуць ператварыцца ў пэўныя прывабныя турыстычныя рэкрэацыі. Але, зразумела, што адных намаганняў па добраўпарадкаванню пахаванняў будзе недастаткова. Патрэбны будуць дзеянні па ўсталяванню сцежак і дарог, арганізацыі элементарных санітарна–гігіенічных ўмоў, інфармацыйных стэндаў, знакаў. І толькі пры такім комплексу мерапрыемстваў магчыма чакаць, што ўспомненныя і адзначаныя месца крывавых падзей сусветнай гісторыі, стануць заўважнымі з боку турыстычных арганізацый, аграсядзібаў, экскурсійных бюро, а значыць займуць сваё месца ў турах, экскурсійных маршрутах, паходах і вандроўках. Разам жа, гэтая сукупнасць мінорных, але бясконца важных аб’ектаў



Полесгу

чалавечай памяці стане істотнаю часткаю турыстычнай прывабнасці нашай краіны як для нашых грамадзян, так і для яе гасцей з замежжа.

### *Спіс выкарыстаных крыніц:*

1. Расійскі дзяржаўны ваенна гістарычны архіў г. Масква ( далей – РДВГА г. Масква), Ф. 2644, Воп.1, Адз.хах..52., Арк.8,9.
2. РДВГА г. Масква, Ф.2638, Воп.1, Адз. Зах.31, Арк.6.
3. Историческая летопись.//Исторический вестник. –1915. –№4. –С.XXXIV.
4. РДВГА г. Масква, Ф.2638, Воп.1, Адз. Зах.31, Арк.6.
5. Там жа.
6. Богданов, В. Воинские захоронения Первой мировой войны на территории Беларуси: современное состояние Доклад на международной научно–практической конференции "Беларусь в годы Первой мировой войны. Сморгонщина: трагедия, героизм, память". г. Сморгонь. май 2007 г. (с исправлениями по состоянию на май 2008 г.)// Режим доступа – http://www.fortressby.com/index.php?option=com_deeppockets&task=catContShow&cat=76&id=143&Itemid= (15.08.2013)

Полесгу